им. М. Танка; редкол.: В.В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 177–180.
7. *Солский, В.* 1917 год в Западной области и на Западном фронте / В. Солский ; науч. ред. С.Н. Хомич. – Минск: Тесей, 2004. – 224 с.
8. *Лапановіч, С.Ф.* Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.) / С.Ф. Лапановіч; М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь; установа адукацыі «Акадэмія М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь». – Мінск: Акад. МУС, 2010. – 127 с.
9. *Латышонак, А.* Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – Вільня: Ін-т беларусістыкі; Беласток: Беларус. гіст. т-ва, 2010.
10. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.
11. *Ладысеў, У.* Спробы самавызначэння Беларусі пасля ўстанаўлення савецкай улады ў краі / У. Ладысеў // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – С. 331 – 337.
12. *Мазец, В.* БНР – гістарычны выбар нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння / В. Мазец, М. Сташкевіч // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – С. 359–370.
13. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: док. и материалы / сост. В.Д. Селеменев (рук.) [ и др.]: науч. ред. М.Ф. Шумейко. – Минск: Лимариус, 2005. – 304 с.
14. МАНІХВЭСТ Часовага Работніча-Селянскага Савецкага Правіцяльства Беларусі // Весткі Часовага Рабоча-Сялянскага Радаваго (Советского) Ураду Беларусі. – 1919. – 19 студз. [Фотакопія].
15. *Вішнеўскі, А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.
16. *Хоміч, С.* Літоўска-Беларуская ССР / С. Хоміч // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – С. 405 – 419.
17. Программа русской добровольческой армии. Бюллетень белорусского политического комитета при армии Булак-Балаховича «Звястун» № 1 за 1920 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 60п. – Воп. 3. – Спр. 767. – Арк. 2.
18. История органов внутренних дел Беларуси: курс лекций / А.Ф. Вишневский [и др.]; под ред. А.Ф. Вишневского; М-во внутрен. дел. Респ. Беларусь, УО «Акад. М-ва внутрен. дел Респ. Беларусь». – Минск: Акад. МВД, 2010. – 218 с.

SUMMARY

*The article is devoted to the situation in Belarus in 1917 – 1920s years. The author considers the changes that took place in social-economic, political and cultural life of Belarus in 1917–1920s in connection with main events of national-formation in this period. In the article the author describes facts that influenced the formation of Belarusian statehood and territorial integrity. The Manifesto, which declared the formation of the Belarusian Soviet Republic in January, 1 1919, is analyzed in the article. The author summarizes that the name of the Republic was Belarusian Soviet Independent Republic (BSIR).*

*It is emphasized that a new stage in the development of the Belarusian society and other nations, which were a part of the Russian Empire in the XX th century, came from the February Revolution and later these countries gained independence.*

Паступіў у рэдакцыю 12.03.2012 г.

*УДК 94(47+57)«1920/1930»*

**В.А. Йоцюс,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ПЕРАСЯЛЕНЧАЯ ПАЛІТЫКА Ў СССР (1920–1930 гг.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Праблема перасялення працоўных рэсурсаў носіць міждысцыплінарны характар і вывучаецца шматлікімі навукамі – дэмаграфіяй, сацыялогіяй, эканомікай, гісторыяй.

Абапіраючыся на грунтоўную крыніцазнаўчую базу, якая складаецца з манаграфічных і дысертацыйных даследаванняў і ахоплівае перыяд з 1920-х гг. па сённяшні дзень, дае магчымасць вызначыць галоўную мэту даследавання – прасачыць ход вывучэння і ступень даследаванасці праблемы перасялення працоўных рэсурсаў у СССР на розных этапах.

У сваім даследаванні мы акрэсліваем наступныя задачы – вылучыць перыяды у вывучэнні праблемы перасялення працоўных рэсурсаў у СССР; прааналізаваць асаблівасці праблематыкі прац гісторыкаў па тэме перасяленчай палітыкі.

У 20-я гг. XX ст. агульнасаюзнай праблемай з'яўлялася «аграрнае перанасяленне», якое аказвала негатыўнае ўздзеянне на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны і сур'ёзна ўплывала на выпрацоўку эканамічнай стратэгіі Савецкай улады. Гэта абумовіла вялікую цікавасць даследчыкаў да пытання перасялення як механізма ліквідацыі аграрнага перанасялення.

У 1922 г. у Маскве быў адкрыты Дзяржаўны навукова-даследчы каланізацыйны інстытут (Дзяржкаланіт) – спецыялізаваная навуковая ўстанова, якая займалася праблемамі пераразмеркавання працоўных рэсурсаў з мэтай асваення запушчаных зямель. Адным з вядучых эканамістаў гэтага інстытута быў прафесар Л.І. Лубны-Герцык – загадчык аддзела міграцыйных і каланізацыйных працэсаў. З 1921 па 1929 г. ён выкладаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце. У манаграфіі «Что такое перенаселение?» навуковец даказваў, што прычынай аграрнага перанасялення з'явіўся хуткі рост сельскага насельніцтва ў пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і адсталае развіццё агракультуры [11]. У 1924 г. ён займаўся выяўленнем «лішняга» сельскага насельніцтва, якое не магло знайсці працу ні ў сельскай гаспадарцы, ні ў прамысловасці. У чатырох раёнах еўрапейскай часткі СССР ён налічыў 14,25–18,9 млн чалавек. Рашэнне гэтай праблемы Лубны-Герцык бачыў у перасяленні за Урал «лішняга» насельніцтва.

Яшчэ адным даследчыкам, які займаўся праблемамі перасялення, з'яўляецца М.В. Турчанінаў. На аснове заявак ад губерняў ён вызначаў колькасць «лішніх» працоўных рэзерваў у СССР у памеры 13,5 млн чал. Па БССР гэта лічба склала 1,4 млн чал. [17, с. 11].

У 1920-я гг. вядомым тэарэтыкам перасяленчай справы быў прафесар Дзяржаўнага НДІ землеўпарадкавання і перасяленняў І.Л. Ямзін. У 1922–1926 гг. ён займаў пасаду намесніка дырэктара гэтай установы. Яго навуковая дзейнасць была прысвечана вывучэнню пытанняў унутранай каланізацыі і перасяленняў. Аграрнае перанасяленне ён тлумачыў нізкай прыбытковасцю сялянскіх гаспадарак і адсутнасцю магчымасці атрымання неземляробчых прыбыткаў [24].

Высновы вышэйназваных даследчыкаў з'явіліся тэарэтычнай падставай для распрацоўкі практычных мерапрыемстваў перасяленчых органаў.

Глыбокім аналізам праблемы аграрнага перанасялення адрозніваецца праца «Аграрное перенаселение и коллективизация деревни» А. Лібкінда [9]. Ён адным з першых стаў тлумачыць перанасяленне з марксісцка-ленінскіх пазіцый – не адсутнасцю зямлі, а нераўнамерным размеркаваннем зямельнага фонду і дыферэнцыяцыяй сярод сялян. Правядзенне калектывізацыі і індустрыялізацыі, па яго меркаванні, павінна было зняць праблему лішніх працоўных рэсурсаў, таму што калектывізацыя павінна спрыяць інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, развіццю працаёмкіх культур, а жыллёвае, дарожнае і прамысловае будаўніцтва змогуць даць працу мільёнам чалавек.

Спецыяльныя працы аб сельскагаспадарчым перасяленні ў гэты перыяд выходзілі ў выглядзе асобных брашур і артыкулаў, аўтарамі якіх з'яўляліся спецыялісты, непасрэдна звязаныя з правядзеннем перасяленчых мерапрыемстваў у СССР. У літаратуры шырока асвятляліся практычныя мерапрыемствы Савецкай улады ў цэнтры і на месцах па арганізацыі перасяленчай справы, тлумачыліся задачы і асаблівасці савецкага перасялення, характарызаваліся раёны, куды планавалася перасяленне [17, с. 14].

Тэма прамысловага перасялення значна слабей прадстаўлена ў літаратуры 20–30-х гг. XX ст. Галоўным чынам, гэта артыкулы па арганізаваным наборы працоўных у прамысловасць Сібірскага, Алтайскага і іншых рэгіёнаў, а таксама даведнікі для вярбоўнікаў, якія насілі прапагандысцкі характар.

Такім чынам, асаблівасцю першага перыяду вывучэння перасяленчай палітыкі была наяўнасць атмасферы дыскусій паміж прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай (Л.І. Лубны-Герцык, І.Л. Ямзін і інш.) і марксісцкай (А. Лібкінд) школы. Аўтары, якія не з'яўляліся марксістамі, аграрнае перанасяленне і вымушаную міграцыю тлумачылі малазямеллем, нізкай прыбытковасцю сялянскіх гаспадарак, ростам насельніцтва, адсутнасцю неземляробчых прыбыткаў. Даследчыкі марксісцкага кірунку прычыну малазямелля бачылі ў нераўнамерным размеркаванні сродкаў вытворчасці, а перасяленне разглядалі як праяву класавай барацьбы ў вёсцы. Большасць першых савецкіх даследчыкаў яшчэ прытрымліваліся старой, дарэвалюцыйнай метадалогіі. Уплыў марксісцкай школы быў тады яшчэ нязначным.

У пачатку 30-х гг. XX ст. праблема аграрнага перанасялення была вырашана. У сувязі з гэтым практычная і даследчая цікавасць да пытання аграрнага перасялення знікла. Яшчэ адным фактарам, які аказаў уплыў на гістарыяграфію перасяленчай палітыкі 1920–1930 гг., з'явіўся перапіс насельніцтва 1937 г., названы савецкім кіраўніцтвам «дэфектным», а яго матэрыялы былі засакрэчаны. У выніку, доступ да архіўных дакументаў быў істотна абмежаваны, звузілася праблематыка і скарацілася колькасць публікацый па гэтай праблеме.

Вялікая Айчынная вайна прыпыніла працу па распрацоўцы праблем перасялення. Толькі пасля яе заканчэння з'явіліся кандыдацкія дысертацыі В.І. Вянецкай «К вопросу о переселенческом движении» [4], І.Я. Куварына «Сельскохозяйственное переселение в СССР и его значение в развитии производительных сил» [8]. Аўтары вялікую ўвагу надалі праблеме перасялення ў 20-я гг., але 30-я гг. засталіся па-за рамкамі даследаванняў навукоўцаў.

Канец 1950-х гг. адзначаны пашырэннем вывучэння пытанняў перасялення працоўных рэсурсаў у 20–30-я гг. XX ст. Гэтаму спрыяла адкрыццё некалькіх навукова-даследчых цэнтраў па вывучэнні праблем народанасельніцтва: у Сібірскім аддзяленні АН СССР, МДУ і ў Інстытуце сацыялагічных даследаванняў АН СССР. Гэтыя ўстановы займаліся праблемамі аднаўлення, распрацоўкай новага паняційнага апарату, метадаў даследавання, аналізам паказчыкаў, якія поўна адлюстроўвалі тэрытарыяльнае пераразмеркаванне насельніцтва.

На гэтым этапе даследаванні характарызуюцца вялікім аб'ёмам тэарэтычнага матэрыялу па міграцыі насельніцтва, у іх прадстаўлены багаты фактычны матэрыял, але гістарычны момант практычна адсутнічае. Найбольш значнымі з'яўляюцца сацыялагічныя працы Л.А. Рыбакоўскага [20], В.І. Перавядзенцава [15], П.П. Літвякова [10]. У сваіх працах аўтары даказвалі, што толькі пры дапамозе планавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перасяленняў можна рацыянальна выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы.

У БССР вывучэннем пытанняў народанасельніцтва займаліся створаныя ў 1960-х гг. Інстытут сацыялогіі і Інстытут статыстыкі і аналізу пры Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Супрацоўнікамі гэтых навукова-даследчых інстытутаў А.Н. Пяшковай [16], А.А. Ракавым [18], Л.Я. Ціханавай [23] вывучаліся асноўныя заканамернасці, маштабы, кірункі, інтэнсіўнасць міграцыі ў БССР. Неабходна адзначыць, што вышэйназваныя аўтары разглядалі праблему з пазіцый дэмаграфіі, сацыялогіі і эканомікі.

Сярод гістарычных даследаванняў варта адзначыць манаграфію М.А. Біліма. Аўтар надаў вялікую ўвагу вывучэнню палітыкі дзяржаўнага перасялення жыхароў цэнтральных і заходніх абласцей СССР на малазаселеныя тэрыторыі [3].

Фундаментальным гістарычным даследаваннем з'яўляецца «Переселенческая политика Советского государства и ее осуществление в СССР (1917 – июнь 1941 г.)» М.І. Платунова. У манаграфіі разглядаюцца змест і арганізацыйныя формы перасяленчай палітыкі ў міжваенны перыяд. Аўтар вылучыў некалькі этапаў у перасяленчай палітыцы, якая праводзілася ў перыяд з 1917 па 1941 г., ахарактарызаваў формы перасяленчага руху, выявіў перадумовы перасяленчай палітыкі для кожнага перыяду. Аднак шматпланавасць тэмы, маштабнасць рэгіёна даследавання не далі магчымасці аўтару падрабязна асвятліць рэалізацыю перасяленчай палітыкі ў асобных рэгіёнах [17].

Гістарыяграфія канца 1950–1980-х гг. заклала асновы для далейшага вывучэння праблем перасялення, назапасіла значны аб'ём фактычнага матэрыялу. Аднак аўтары не выкарысталі неабходныя архіўныя дакументы, якія знаходзіліся пад грыфам «сакрэтна».

Буйныя змены адбыліся ў вывучэнні міграцыйных праблем у 1990-я гг. Напачатку іх былі апублікаваны асноўныя вынікі перапісаў 1937 і 1939 гг. і іншыя засакрэчаныя матэрыялы, якія тычацца 1920–1930-х гг. Гэта дазволіла па-іншаму зірнуць на падзеі і праблемы перасяленчай палітыкі ў СССР. Пачынаюць змяняцца метадалагічныя падыходы да вывучэння сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў краіны ў 1920–1930-я гг. У сувязі з гэтым навукоўцамі была пашырана тэматыка даследаванняў па праблеме перасялення. Сярод абагульняльных прац неабходна адзначыць кандыдацкія дысертацыі расійскіх даследчыкаў: М.Б. Дзянісенка [6], В.А. Кір'янава [7]. На новым этапе ўзрасла цікавасць гісторыкаў да вывучэння рэгіянальных асаблівасцей міграцыйных працэсаў у 20–30-я гг. Міграцыю сельскага насельніцтва ў сярэдняе Паволжа вывучаў А.В. Возераў [12]. Міграцыі на Урал знаходзіліся ў цэнтры ўвагі В.В. Паўлавай [14]. Я.В. Цёр у сваёй дысертацыі разгледзеў стан, рух і змены ў структуры народанасельніцтва на Кубані з 1860-х па 1930-я гг. [22]. Адным з пытанняў, знятых аўтарам, з'яўляецца перасяленне ў 30-я гг. чырвонаармейцаў з беларускай ваеннай акругі ў гэты рэгіён.

Такім чынам, аналіз выдадзенай літаратуры па праблеме перасялення працоўных рэсурсаў паказвае, што ў савецкай і расійскай гістарыяграфіі знайшлі адлюстраванне некаторыя аспекты дзяржаўнай перасяленчай палітыкі. Аднак БССР як адзін з важных рэгіёнаў-донараў амаль не разглядаецца.

У беларускай гістарыяграфіі ёсць толькі некалькі прац, прысвечаных перасяленням. Сярод іх – манаграфія П.Д. Верашчагіна «Крестьянские переселения из Белоруссии: (Вторая половина XIX в.)» [5], кандыдацкая дысертацыя З.М. Сямейных «Аграрные миграции белорусского крестьянства в Сибирь в период империализма» [21], напісаныя ў 70–80-я гг. XX ст. Сярод сучасных беларускіх даследаванняў выклікае цікавасць кандыдацкая дысертацыя Н.В. Барабаш «Государственная переселенческая политика в БССР (1946–1965 гг.)» [1]. Аўтар на аснове мясцовых архіўных крыніц правяла комплексны аналіз дзяржаўнай перасяленчай палітыкі ў 1946–1965 гг. і паказала яе ажыццяўленне ў БССР.

Вынікам сумеснай працы сібірскіх і беларускіх гісторыкаў па навукова-даследчым праекце «Белорусы в Сибири. XVII–XX стст.» сталі зборнікі «Белорусы в Сибири» [2] і «Очерки истории белорусов в Сибири в XIX–XX вв.» [13]. У гэтых працах навукоўцы разглядалі такія пытанні, як перасяленне беларускага насельніцтва ў Сібір і фарміраванне беларускай дыяспары ў Сібіры за вялікі гістарычны перыяд (з канца XVI ст. па савецкі час), уклад беларусаў у фарміраванне прамысловых цэнтраў Сібіры, а таксама закранала этнаграфічныя праблемы.

Такім чынам, беларускія гісторыкі звярталі ўвагу на гісторыю перасяленняў у розны час, але рэалізацыя перасяленчай палітыкі Савецкай дзяржавы ў 20–30-я гг. у БССР засталася за рамкамі іх даследаванняў.

Спасылаючыся на вывучаную літаратуру, можна зрабіць пэўныя высновы. Даследаванне праблемы дзяржаўнай перасяленчай палітыкі Савецкага Саюза ў 1921–1939 гг. прайшло ў сваім развіцці некалькі важных этапаў. Першы ахоплівае 1920-я – пачатак 1930-х гг. і характарызуецца пачаткам фарміравання гістарыяграфіі праблемы савецкага перасялення. Гэта было выклікана неабходнасцю тлумачэння прычын перасяленчага руху і яго сацыяльна-эканамічнага значэння ў сістэме гаспадарчых мерапрыемстваў Савецкага ўрада. Аўтары, якія былі звязаны з непасрэднай рэалізацыяй перасяленняў, надавалі ўвагу пытанням «аграрнага перанасялення» ў еўрапейскай частцы СССР. Другі этап вывучэння перасяленчай палітыкі адносіцца да сярэдзіны 1930 – канца 1950-х гг. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэты час назіраецца скарачэнне колькасці даследаванняў па праблемах перасялення. Трэці перыяд – 1960-я – пачатак 1990-х гг. На гэтым этапе выдаюцца першыя манаграфіі, у якіх даследчыкі паспрабавалі выявіць сутнасць, перыядызацыю і маштабы перасяленняў у 20–30-я гг. XX ст. З распадам СССР пачаўся новы этап распрацоўкі міграцыйнай праблематыкі. Навукоўцы атрымалі ў сваё карыстанне рассакрэчаныя архіўныя матэрыялы, што дазволілі выявіць не дастаткова распрацаваныя аспекты ў гісторыі перасяленчай палітыкі.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Барабаш, Н.В.* государственная переселенческая политика в БССР (1946–1965 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Н.В. Барабаш; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2011. – 24 с.
2. Белорусы в Сибири: сб. ст. / Ин-т истории СО РАН, Ин-т истории НАНБ; отв. ред.: В.А. Ламин, Н.С. Сташкевич. – Новосибирск: Ин-т истории, 2000. 160, с.: ил.
3. *Билим, Н.А.* Сто дорог на Восток: Из истории переселения трудящихся на Дальний Восток / Н.А. Билим. – Хабаровск: Кн. изд-во, 1978. –128 с.
4. *Венецкая, В.И.* К вопросу о переселенческом движении: дис. … канд. экон. наук: 08.00.18 / В.И. Венецкая; Моск. экон.-стат. ин-т. – М., 1953. – 17 с.
5. *Верещагин, П.Д.* Крестьянские переселения из Белоруссии: (Вторая половина XIX в.) / П.Д. Верещагин. – Минск: БГУ, 1978. – 144 с.
6. *Денисенко, М.Б.* Демографическое развитие России и СССР в первой половине XX века: дис. … канд. экон. наук: 08.00.18 / М.Б. Денисенко; Моск. гос. ун-т. – М., 1992. – 16 с.
7. *Кирьянова, В.А.* Социально-экономические и политические процессы в деревне в 1933–1937 гг. (На материалах Моск., Рязан. и Тул. обл.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.01;07.00.02 / В.А. Кирьянова; Моск. гос. откр. пед. ин-т. – Рязань, 1994. – 26 с.
8. *Куварин, И.Я.* Сельскохозяйственное переселение в СССР и его значение в развитии производительных сил: дис. … канд. экон. наук : 08.00.18 / И.Я. Куварин; Акад. обществ. наук при ЦК КПСС. – М., 1963. – 16 с.
9. *Либкинд, А.* Аграрное перенаселение и коллективизация деревни / А. Либкинд. – М.: изд-во «Ком. акад.», 10-я тип. «Мосполиграфа», 1931. –196 с.
10. *Литвяков, П.П.* Научные основы использования трудовых ресурсов / П.П. Литвяков. – М.: Мысль, 1969. – 295 с.
11. *Лубны-Герцык, Л.И.* Что такое перенаселение : серия «научных монографий». Вып. 1. / Л.И. Лубны-Герцык. – М., 1923. – 190 с.
12. *Озеров, О.В.* Миграции сельского населения во второй половине 1920–1930-х гг. по материалам Среднего Поволжья: дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / О.В. Озеров. – Пенза, 2000. – 229 с.
13. Очерки истории белорусов в Сибири в XIX–XX вв. / Г.А. Бочанова, Н.В. Василевская, Ю.М. Гончаров и др.; Рос. акад. наук, Сиб. отд-ние, Ин-т истории, Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Новосибирск : Новосиб. гос. ун-т, 2001. – 237 с.
14. *Павлова, О.В.* Миграции населения на Урале в 1914–1939 гг.: дис.... канд. ист. наук: 07.00.02 / О.В. Павлова. – Уральский гос. пед. ун-т. – Екатеринбург, 2004. – 25 с.
15. *Переведенцев, В.И.* Миграция населения и трудовые проблемы Сибири / В.И. Переведенцев; АН СССР, Ин-т экономики и орг. пром. производства. – Новосибирск: Наука, 1966. – 191 с.
16. *Пешкова, А.Н.* Миграция населения Белоруссии / А.Н. Пешкова. – Минск: [Б. и.], 1973. – 138 с.
17. *Платунов, Н.И.* Переселенческая политика Советского государства и ее осуществление в СССР (1917 – июнь 1941 гг.) / Н.И. Платунов. – Томск: Изд-во Том. ун-та, 1976. – 283 с.
18. *Раков, А.А.* Население БССР / А.А. Раков. – Минск: Наука и техника, 1969. – 219 с.
19. *Рыбаковский, Л.Л.* Миграция населения (вопросы теории) // Рыбаковский Л.Л. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://rybakovsky.ru/migracia2z1.html. – Дата доступа: 10.01.2012.
20. *Рыбаковский, Л.Л.* Народонаселение Дальнего Востока за 100 лет / Л.Л. Рыбаковский. – М.: Наука, 1969. – 183 с.
21. *Семейных, З.М.* Аграрные миграции белорусского крестьянства в Сибирь в период империализма (1900 – 1914 гг): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / З.М. Семейных. – АН БССР, Ин-т истории. – Минск, 1986. – 26 с.
22. *Тёр, Е.В.* Демографические изменения на Кубани под влиянием модернизационных процессов (1860-е гг. – конец 1930 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Ставропольский гос. ун-т. – Ставрополь, 2010. – 26 с.
23. *Тихонова, Л.Е.* Социально-экономические аспекты миграции населения БССР: дис. … канд. экон. наук: 08.00.18 / Л.Е. Тихонова; АН СССР, Ин-т социол. исслед. – М., 1982. – 19 с.
24. *Ямзин, И.Л.* Учение о колонизации и переселениях / И.Л. Ямзин. – М.; Л.: Госуд. Изд-во, тип. «Красный Пролетарий», 1926. – 328 с.



*Summary*

*The attempt to analyse the historiography of the Soviet resettlement policy is made for the first time in Belarusian historiography on the basis of a wide range of historiographic sources on the migration strategies adopted in the 1920 – 1930 s.*

*The objective of this study is to examine the establishment and development of research work in one of the important fields of Belarusian history – the implementation of the Soviet resettlement policy in the BSSR in the 1920 – 1930 s, to define the level of the problem examination and to formulate some basic questions for further research.*


Паступіў у рэдакцыю 07.02.2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

УДК 930(476):33«17/19»

***А.У. Канойка,***
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

## ШЛЯХІ ЗНОСІН У ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ

Вывучэнне стану транспартных камунікацый на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі і іх уплыў на развіццё эканомікі Паўночна-Заходняга краю ў канцы XVIII – пачатку XX ст. бярэ пачатак з канца XVIII ст. Менавіта ў гэты перыяд з'явіліся першыя працы па геаграфічным, статыстычным і эканамічным апісанні далучаных да Расійскай імперыі зямель. Даследаваннем беларуска-літоўскіх губерняў займаліся пераважна прад-